**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# ТУРАНКОЎ АЛЯКСЕЙ ЯЎЛАМПАВІЧ

**КАМПАЗІТАР, ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ МАСТАЦТВАЎ БССР**

**9 (21) СТУДЗЕНЯ 1886 Г. – 27 ВЕРАСНЯ 1958 Г.**

**ФОНД № 206**

**ВОПІС № 2**

**1918–1986 гг.**

**МІНСК 2021**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 2** **ф. 206**

| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ А.Я. ТУРАНКОВА | 1-26 | 1-4 |
| 1.1. | ОПЕРА, ВАКАЛЬНЫЯ ТВОРЫ І ІНШ. | 1-11 | 1-2 |
| 1.2. | ПІСЬМО ДА А.Я. ТУРАНКОВА, ДАКУМЕНТЫ А.Я. ТУРАНКОВА І АБ ІМ | 12-20 | 2-4 |
| 1.3. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 21-26 | 4 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ К.Я. ТУРАНКОВАЙ | 27-36 | 4-5 |
| 2.1. | ВІНШАВАЛЬНЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ І ПІСЬМЫ ДА К.Я. ТУРАНКОВАЙ І ІНШ. | 27-30 | 4-5 |
| 2.2. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 31-36 | 5 |

## Прадмова

**Туранкоў Аляксей Яўлампавіч** нарадзіўся 9 (21) студзеня 1886 г. у шматдзетнай сям'і дворніка ў Санкт-Пецярбургу. У 1892 г. пасля раптоўнай смерці бацькі патрапіў у гарадскі прытулак для дзяцей-сірот. У 1895 г. – у школу так званых "салдацкіх дзяцей" пры адным з армейскіх палкоў, дзе вучыўся ігры на духавых інструментах, скрыпцы і фартэпіяна. Быў прыхаджанінам палкавой царквы, спяваў у царкоўным хоры. У 1901 г. (па рэкамендацыі рэгента) быў накіраваны на трохгадовыя курсы па падрыхтоўцы рэгентаў пры Імператарскай Прыдворнай пеўчай капэле, дзе вывучаў музычна-тэарэтычныя прадметы (гармонію і контрапункт) у А.К. Лядава, наведваў рэгенцкі курс М.А. Сакалова. Адначасова быў залічаны ў школу прапаршчыкаў. З 1904 г. да 1909 г. радавым салдатам адбываў вайсковую павіннасць. З 1909 г. да 1911 г. зарабляў прыватнымі ўрокамі, спяваў у рэстаранах і царкоўным хоры. Страціў усіх родных: маці, 8 братоў і сясцёр. У 1911 г. паступіў у Санкт-Пецярбургскую кансерваторыю (цяпер – Санкт-Пецярбургская дзяржаўная кансерваторыя імя М.А. Рымскага-Корсакава) на кампазітарскі курс А.К. Лядава, але хутка пакінуў яе, бо не меў сродкаў плаціць за навучанне. Уладкаваўся альтыстам у першакласны сімфанічны аркестр Паўлаўска (цяпер тэрыторыя Пушкінскага раёна Санкт-Пецярбурга), дзе дырыжорам працаваў кампазітар і дырэктар Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі А.К. Глазуноў. Пры падтрымцы апошняга зноў паступіў (з правам бясплатнага навучання) на кампазітарскае аддзяленне кансерваторыі Санкт-Пецярбурга. У 1914 г. быў мабілізаваны на фронт. Дэмабілізаваўся ў Гомелі, дзе ў 1918–1919 гг. удзельнічаў у заснаванні музычнай школы, Народнай кансерваторыі (у 1920 г. ператворана ў Дзяржаўную музычную школу 1-й і 2-й ступені, у 1921 – у Дзяржаўны музычны тэхнікум), працаваў у гарадскім сімфанічным аркестры, загадваў музычнай секцыяй гарадскога аддзела народнай адукацыі, кіраваў самадзейнымі харавымі калектывамі. У 1934 г. пераехаў у Мінск, дзе працаваў артыстам аркестра радыёкамітэта. У 1938 г. быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР першага склікання. 28 чэрвеня 1941 г. пры спробе пакінуць Мінск разам з жонкай (В.І. Фалькоўскай) быў абстраляны нямецкім дэсантам. Жонка загінула, ён, паранены, вярнуўся дамоў, жыў у цешчы (медсястры Н.М. Фалькоўскай). У 1943 г. пабраўся шлюбам з К.Я. Ваўчок. У выніку няўдалай аперацыі па вывядзенні кампазітара з горада да партызан быў схоплены і расстраляны сувязны партызанскага атрада, за што ў чэрвені 1944 г. Ваенным трыбуналам Беларусі А.Я. Туранкоў быў асуджаны на 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў (3 кастрычніка 1955 г. ён быў амністыраваны, 21 кастрычніка 1959 г. – рэабілітаваны). У 1954 г. вярнуўся ў Мінск, дзе працягваў займацца творчай дзейнасцю[1].

---

[1] Біяграфічныя звесткі ўзяты з: "Асабістая справа А.Я. Туранкова" (БДАМЛМ, Ф. 119, воп. 2, спр. 17: 6–8); Игумен Савва (Мажуко). "Алексей Евлампиевич Туренков как церковный композитор". // Православие на Гомельщине: историко-культурное наследие и современность: сборник научных статей. – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2010. // http://nashkraj.info/aleksej-evlampievich-turenkov-kak-tserkovnyj-kompozitor/.

У 1901 г. былі напісаны першыя музычныя творы А.Я. Туранкова, у 1916 г. надрукаваны хор “Узник” (“Слушай”) і некалькі рамансаў, у 1923 г. – цыкл песень “Кавачи”, “Песня кузницы”, “Рабочий дворец” і інш. Найбольш вядомымі творамі кампазітара з’яўляюцца: звыш 100 духоўных песнапенняў (да 1917 г.); беларуская сюіта ў 4-х частках (1933), оперы “Кветка шчасця” (1936–1939) і “Яснае світанне” (1958); музыка да фільмаў “Огненные годы” (“Беларусьфільм”, 1939), “Семья Януш” (“Беларусьфільм”, 1941) і інш.; два струнных квартэты (1953), рапсодыя для струннага квартэта (1953) і інш.

У 1932 г. А.Я. Туранкоў стаў членам Саюза кампазітараў БССР (у 1944 г. страціў членства і аднавіў яго ў 1955 г.).

У 1940 г. кампазітар быў узнагароджаны Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і атрымаў званне “Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР”.

А.Я. Туранкоў памёр 27 верасня 1958 г. Пахаваны на Вайсковых могілках у Мінску.

Дакументы А.Я. Туранкова паступілі ў БДАМЛМ ад Нэлі Іванаўны Карачун (пляменніцы ўдавы) у 2006 г. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 2, у які ўвайшло 36 спраў (113 дак.) за 1918–1986 гг.

Вопіс складаецца з 2 раздзелаў, складзеных па намінальна-храналагічным прынцыпе.

Першы раздзел – “Дакументы А.Я. Туранкова” – прадстаўлены операй, вакальнымі і інструментальнымі творамі і інш., пісьмом да А.Я. Туранкова, артыкуламі і нататкамі пра яго, праграмамі опернага спектакля “Яснае світанне”, тэматычным планам выдавецтва “Беларусь” і пісьмамі з упамінаннем А.Я. Туранкова, яго фатаграфіямі: індывідуальнымі, з К.Я. Туранковай (жонкай) і неўстаноўленай асобай, пахавальнай працэсіі, яго магілы і помніка за 1918–1986 гг.

Другі раздзел – “Дакументы К.Я. Туранковай” – складаецца з віншавальных тэлеграм, паштоўкі і пісьмаў да К.Я. Туранковай, запрашальнага білета на навуковую канферэнцыю, фатаграфій К.Я. Ваўчок з іншымі ўдзельнікамі 1-га Мінскага і 1-га Усебеларускага з’ездаў таварystваў “Прэч Няпісьменнасьць”, выкладчыкамі і выпускнікамі завочнага сектара Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута і інш., фатаграфій М. Гардзейчыка (1-га мужа К.Я. Туранковай) і інш. за 1926–1967 гг.

Прадмову склала
Вядучы архівіст В.Ф. Шаталава
08.04.2020

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 18.03.2021
№ 3

ФОНД № 206
ВОПІС № 2
1918-1986

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|

## 1. ДАКУМЕНТЫ А.Я. ТУРАНКОВА

### 1.1. ОПЕРА, ВАКАЛЬНЫЯ ТВОРЫ І ІНШ.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ["Кветка шчасця"]. Опера паводле п'есы М. Чарота "На Купалле". Клавір.<br>Фотакопія аўтографа з Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У.І. Леніна [пасля 1945 г.] | 1936-1939 | 76 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 2 | "Камсамольска-Варашылаўская", "Песня кожевников", "Размахнись и приударь" і інш. Песні для змяшанага хору, песні для 2-х галосага хору з фартэпіяна, песня для голасу з фартэпіяна і інш. Словы Э.С. Агняцвет, Дз. Беднага, М.І. Рыбацкага і інш.<br>Фотакопіі друкаваных выданняў з Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У.І. Леніна [пасля 1945 г.] | 1923-1940 | 73 | 21 | |
| 3 | "19 аднагалосых дзіцячых песень з акомпанімэнтам ф.-п.". Словы А.І. Александровіча, З. Бядулі, Я. Купалы, Ц. Гартнага і інш.<br>Фотакопія друкаванага выдання [пасля 1945 г.] | 1932 | 44 | 1/19 | |
| 4 | "Дуб", "Мароз", "Нашаму святу" і інш. Песні для нізкага голасу з фартэпіяна [і інш.]. Словы Я. Коласа і Я. Купалы.<br>Аўтограф.<br>Прыкладзены тэкст песні "Дуб" - рукапіс А.Я. Туранкова. Л. 3 | 1948 - [1950-я гг.] | 7 | 5 | |
| 5 | "Дзе б ні быў я...", "Мне калісьці падабалася", "Сябры франтавыя" і інш. Песні і рамансы для сярэдняга голасу з фартэпіяна. Словы П. Барэйкі, К.Я. Ваншэнкіна і інш.<br>Аўтограф.<br>Прыкладзены тэксты песень "Мне калісьці падабалася" і "Твои защитники" - выразкі з часопісаў. Лл. 1, 7 | 1954 - [1950-я гг.] | 25 | 13 | |
| 6 | "Буду спяваць песні", "Літве", "Усход сонца" і інш. Песні для высокага голасу з фартэпіяна. Словы П. Барэйкі, Я. Коласа, Э. Межэлайціса і | 1955-1958 | 11 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | П.Ф. Прыходзькі.<br>Аўтограф | | | | |
| 7 | "Совецкім народам", "Ты зялёная дубрава" і інш. Песні для хору з фартэпіяна. Словы М.І. Калачынскага, Я. Коласа і Я. Купалы.<br>Чарнавы аўтограф, аўтограф | [1950-я гг.] | 6 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 8 | "Вальс", "Вальс Мечты" і інш. для фартэпіяна. Клавір.<br>Аўтограф | [1950-я гг.] | 11 | 5 | |
| 9 | "Романс" для скрыпкі і кларнэта. Партытура з дароўным надпісам А.Я. Туранкова К.Я. Туранковай (жонцы).<br>"Юмореска" для кларнэта з фартэпіяна. Партытура.<br>Аўтограф | [1950-я гг.] | 5 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 10 | Тэксты песень і рамансаў А.Я. Туранкова на словы Я.І. Альдэкопава, М.А. Багдановіча, А.К. Гурло і інш.<br>Сшытак з аўтографам, асобныя старонкі - аўтограф, машынапіс | 1956 - [1950-я гг.] | 11 | 5/10 | |
| 11 | Спіс музычных твораў А.Я. Туранкова, складзены па каталогах Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У.І. Леніна, і спіс нявыдадзеных музычных твораў А.Я. Туранкова.<br>Машынапіс з дапіскамі і праўкай.<br>Спісы музычных твораў А.Я. Туранкова на словы М.А. Багдановіча, Я. Коласа і Я. Купалы, складзены К.Я. Туранковай.<br>Аўтограф К.Я. Туранковай | [1950-я гг.] - 1975 | 18 | 3 | |
| | **1.2. ПІСЬМО ДА А.Я. ТУРАНКОВА, ДАКУМЕНТЫ А.Я. ТУРАНКОВА І АБ ІМ** | | | | |
| 12 | Пісьмо сакратара аддзела прапаганды і агітацыі ЦК ЛКСМ Беларусі Д. Бальшова А.Я. Туранкову з запрашэннем да ўдзелу ў пасяджэнні журы конкурсу на лепшыя песню і марш фестываля | [да 1958 г.] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 13 | Выпіска з пратакола пасяджэння Саюза кампазітараў СССР аб аднаўленні А.Я. Туранкова ў Саюзе кампазітараў у сувязі з загадам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб зняцці з яго судзімасці | 1955 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | * * * | | | | |
| 14 | А.М. Бачыла. "Сэрцам і песнямі з народам", Д. М. Жураўлёў. "У музыцы - жыцця працяг" і інш. Артыкулы і нататка да 75-ці, 95-ці і 100-годдзяў з дня нараджэння А.Я. Туранкова. Выразкі з газет | 1961-1986 | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 15 | Без аўтара. "Новыя работы кампазітара А.Е. Туранкова". Нататка. Фотакопія з газеты "ЛіМ" (№ 38, 1938). З. Федчанка. "Мелодыі жыцця". Нататка пра А.Я. Туранкова. Выразка з газеты "Сцяг перамогі" за 21.01.1958 г. | | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 16 | Праграмы опернага спектакля "Яснае світанне" А.Я. Туранкова, пастаўленага ў тэатры оперы і балета БССР | 1958, 1964 | 21 | 2 | |
| 17 | "Тематический план издательства "Беларусь" на 1965 год. Музыкальная литература" з упамінаннем зборніка А.Я. Туранкова. Брашура | 1964 | 5 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 18 | Пісьмо загадчыка аддзела сімфанічнай музыкі [К.К.] Сяжэнскага К.Я. Туранковай аб атрыманні партытуры сімфанічнай паэмы А.Я. Туранкова "О мире и труде" | 1966 | 1 | 1 | |
| 19 | Чарнавік распіскі ў атрыманні музычных твораў А.Я. Туранкова, падрыхтаванай К.Я. Туранковай і адасланай у выдавецтва "Беларусь". Машынапіс з дапіскамі і праўкай К.Я. Туранковай | [1972-1974] | 3 | 1 | |
| 20 | Суправаджальнае пісьмо загадчыка рэдакцыі эстэтычнага выхавання выдавецтва "Музична Україна" А. Пілінскай да зборніка "Жовтенята" з песняй А.Я. Туранкова "Дождик", высланага К.Я. Туранковай | 1973 | 1 | 1 | |
| | **1.3. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 21 | Фатаграфіі А.Я. Туранкова, індывідуальныя. З анатацыяй К.Я. Туранковай. Л. 1 і дароўным надпісам А.Я. Туранкова Н.М. Фалькоўскай | 1918, [1930-я гг.] - [да верасня 1957 г.] | 9 | 9 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | (цешчы). Л. 4 | | | | |
| 22 | Фотапартрэт А.Я. Туранкова | [сяр. 1940-х гг.] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 23 | Фатаграфія А.Я. Туранкова з неўстаноўленай асобай | 1918 | 1 | 1 | |
| 24 | Фатаграфіі А.Я. Туранкова з К.Я. Туранковай (жонкай) | [сяр. 1940-х гг.], [да 1958 г.] | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 25 | Фатаграфіі пахавальнай працэсіі і месца пахавання А.Я. Туранкова на Вайсковых могілках Мінска. Адна - з анатацыяй К.Я. Туранковай. Л. 3 | 1958 | 3 | 3 | |
| 26 | Фатаграфіі помніка А.Я. Туранкова | [пасля 1958 г.] | 2 | 2 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ К.Я. ТУРАНКОВАЙ** | | | | |
| | **2.1. ВІНШАВАЛЬНЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ І ПІСЬМЫ ДА К.Я. ТУРАНКОВАЙ І ІНШ.** | | | | |
| 27 | Віншавальная тэлеграма і паштоўка Л.П. Александроўскай К.Я. Туранковай з днём Кастрычніцкай рэвалюцыі і Новым годам | 1959, 1960 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 28 | Пісьмы загадчыка аддзела літаратуры і мастацтва Упраўлення прапаганды і агітацыі ЦК КПБ І.В. Гутарава і старшыні праўлення БТА Л.П. Александроўскай да К.Я. Туранковай з сваімі рабочымі тэлефонамі і ўказаннем гадзін прыёму | 1948, 1952 | 2 | 2 | |
| 29 | Віншавальная тэлеграма Саюза кампазітараў БССР К.Я. Туранковай | [1964] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 30 | "Пригласительный билет на научную конференцию, посвящённую 50-летию Великой Октябрьской Социалистической революции". Брашура | 1967 | 9 | 1 | |
| | **2.2. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 31 | Фатаграфіі К.Я.Ваўчок (у 2-м шлюбе Туранковай) з іншымі ўдзельнікамі 1-га Мінскага і 1-га | 1926 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Усебеларускага з'ездаў таварыстваў "Прэч Няпісьменнасьць" | | | | |
| 32 | Фатаграфіі К.Я. Ваўчок з іншымі выкладчыкамі і выпускнікамі завочнага сектара Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута і інш. | [пач. 1930-х гг.] - 1933 | 3 | 3 | |
| 33 | Фатаграфіі выкладчыцы беларускай мовы К.Я. Ваўчок з выкладчыкамі і выпускнікамі Беларускай рэспубліканскай зубалячэбнай школы (1948) і Мінскай школы медыцынскіх лабарантаў (1952).<br>1-я - з дароўным надпісам выпускнікоў К.Я. Ваўчок | | 3 | 2 | |
| 34 | Фатаграфіі К.Я. Туранковай ля магілы А.Я. Туранкова | 1958, [пасля 1958 г.] | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 35 | Фатаграфіі Мікалая Гардзейчыка (1-га мужа К.Я. Туранковай) з іншымі ўдзельнікамі Мінскіх акруговых шасцітыднёвых настаўніцкіх курсаў па павышэнні кваліфікацыі (1927) і выкладчыкамі і вучнямі 11-й Мінскай ФЗС (1933) | | 4 | 2 | |
| 36 | Фатаграфія Я.І. Барычэўскага, П.А. Бузука, І.І. Замоціна, М.М. Піотуховіча і інш. выкладчыкаў і выпускнікоў Літаратурна-лінгвістычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага вышэйшага педагагічнага інстытута | 1933 | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 36 (трыццаць шэсць)

спраў з № 1 па № 36 , 113 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

вяд. архівіст В.Ф. Шаталава

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.